8 САКАВІКА — ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН. СА СВЯТАМ, МІЛЫЯ, ДАРАГІЯ, ЛЮБІМЫЯ!

Газета для вас

2 — 8 сакавіка 2001 г.

№ 9 (272)

Грамадска-палітычны штотыднёвік, выдаецца са студзеня 1997 года

Падпісныя індэксы: 63834 (індывідуальная) 64145 (ведамасная)

ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН



Фота Валерыя МІНЮКА, г. Івацэвічы.

ШТО ТАКОЕ — ЖАНЧЫНА?

Што такое — жанчына?
За безліч дзён і начэй
На гэта пытанне мужчыны
Не адказалі яшчэ.

Можа, гэта іскрыстасць
Адданых і мілых вачэй?
Ці, як слязінка, чысты
Срэбразвонны ручэй?

А, можа, то спеў птушыны,
Што чуецца ў небе вясной?
Ці ва ўбранні жанчыны
Постаць феі лясной?

А, можа, яна аблачынка,
Што ў сінім небе плыве?
Ці летуценне адзінага,
Што толькі ёю жыве?

А, можа, яна вечнасць,
Што з недраў зямлі ідзе?
Ці светлы праменьчык сонца
У крынічнай, чысцюткай вадзе?

А, можа, яна — аснова
Усяго, што на свеце ёсць?
Самога жыцця абнова
І вечная маладосць.

Таццяна КАЗЛОВА.
г. Івацэвічы.

Рынок труда и безработицы

Барановичи по уровню безработицы всегда выглядели благополучно, но это только в цифрах, а на деле?

В последнее время предприятия постоянно заявляют о сокращении работников. Вот и администрация трикотажной фабрики предупредила о сокращении 80 человек, есть такие намерения и у железной дороги. Центр занятости выделил 192 млн. рублей хлопчато-бумажному объединению из средств Государственного фонда содействия занятости для открытия новых рабочих мест, чтобы предприятие не уволило 692 человека.

Галина САСИМ.

"Каскад"

ПРУЖАНЫ. Еще в декабре 1997 года вышло решение райисполкома о создании в Пружанском районе двух военно-патриотических клубов — "Каскад" в д. Новые Засимовичи и "Гепард" в д. Слободка. Клубы были созданы и работают по сей день.

Шуляк Александр Геннадьевич, руководитель клуба "Каскад", занимается с юношами и девушками в возрасте от 14 до 18 лет, обучает их элементам рукопашного боя, основам военной подготовки, ребята играют в волейбол, футбол, теннис. Предварительной ступенью клуба является "Юнармеец", где собрались подростки 11–14 лет.

Первоначально ребята тренировались на территории военной части, где три раза в неделю им предоставляли тренажерный зал. Но с сентября 1999 года тренировки проводятся в помещении Пореслянской СШ.

Ребята участвуют в областных и районных соревнованиях, зарницах, походах и турслетах, награждаются путевками в лагеря и санатории, дипломами и грамотами.

Сейчас "каскадовцы" обходят близлежащие деревни, разговаривают с участниками войны, собирают данные для открытия в своей школе Музея боевой славы, где будет отражена вся история Брестской крепости, а также партизанского движения на территории района во время Второй мировой войны.

Юлия ТЕЛЬПУК.

Цэнтр дапамогі

ДРАГІЧЫН. Нядаўна тут адкрыты сацыяльна-педагагічны цэнтр. У ім працуюць сацыяльны педагог, педагог-псіхолаг і дэфектолаг. Яны займаюцца аказаннем прафесійнай педагагічнай і псіхалагічнай дапамогі дзецям і іх бацькам, арганізоўваюць кансультаванне.

Сюды звярнулася ўжо нямала гараджан і жыхароў раёна.

Дэвізам цэнтра, як лічаць самі работнікі, павінны стаць наступныя радкі:

Какая тонкая работа —
Счастливым сделать
хоть кого-то!
Цветы удачи принести,
От одиночества спасти...

Галіна АЛЕКСІЕВІЧ.

Маладыя, таленавітыя

ПРУЖАНЫ. У райцэнтры праведзены конкурс "Настаўнік года раёна — 2001". У спісе пераможцаў толькі маладыя педагогі.

Так, першае месца заняла Іна Якімавец, якая выкладае сусветную і мастацкую культуру ў Пружанскай СШ № 1, другое — Марына Шлеба, настаўніца пачатковых класаў Пружанскай СШ № 3, трэцяе — Ганна Амельянец, настаўніца пачатковых класаў Клепачскай СШ.

Кацярына НОВІК.

Ці патрэбна зладзеям "стабілізацыя"?

ІВАЦЭВІЧЫ. Яшчэ пры савецкай уладзе, як паведаміла афіцыйная статыстыка, чвэрць народнага дабра ў нашай краіне раскрадвалася. У апошнія гады гэтая ганебная з'ява атрымала яшчэ большае распаўсюджванне. Так, летась раённым судом разгледжана 251 крымінальная справа. 107 з іх — крадзяжы. Асуджана 158 чалавек. Хто ж займаецца крадзяжамі? Больш за ўсё — гэта беспрацоўныя — 101 чалавек. На другім месцы — рабочыя (75 чалавек), на трэцім — калгаснікі (53 чалавекі).

Чаму ж сёння так многа крадуць? Прычына адна: дрэнная матэрыяльная забяспечанасць нашых жыхароў. Беспрацоўе, мізэрныя зарплата і пенсіі не дазваляюць нашым грамадзянам жыць па-людску. Колькі будзе гэта працягвацца на фоне "стабілізацыі" беларускай эканомікі, пакуль што невядома.

Мікалай ДЗМІТРУК.

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на II квартал 2001 года.

Падпісная цана на "ГАЗЕТУ ДЛЯ ВАС" складае:

для індывідуальных падпісчыкаў (індэкс 63834) на адзін месяц — 710 рублёў, на квартал — 2130 рублёў;

для ведамаснай падпіскі (індэкс 64145) на адзін месяц — 1379 рублі, на квартал — 4137 рублёў.

Газет для вас выдаецца шмат. "ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС" — адна. Не забудзьцеся падпісацца на яе.

ЧАС РЭСПУБЛІКІ

Профсоюзы жалуются

26 февраля в Женеве начались консультации между представителями Международной организации труда (МОТ) и белорусской правительственной делегацией во главе с министром юстиции Геннадием Воронцовым. В состав делегации также входят представители трех министерств - иностранных дел, труда и промышленности.

Предметом переговоров в Женеве является жалоба, направленная в МОТ в начале июня 2000 года лидерами трех крупнейших отраслевых профсоюзов Беларуси - работников автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения, радиоэлектронной промышленности и агропромышленного комплекса, а также Белорусского конгресса демократических профсоюзов, в состав которого входят пять профсоюзных организаций. В жалобе приведены многочисленные факты вмешательства государства в деятельность профсоюзов, в том числе препятствования созданию и регистрации профсоюзных структур, а также попыток расколоть рабочее движение.

Растут тарифы

В феврале в Беларуси вновь выросли тарифы на жилищно-коммунальные услуги.

По сравнению с январем на 5,1 процента увеличилась квартплата (техобслуживание) и плата за пользование лифтом, на столько же подорожали отопление, горячая вода, холодная вода и канализация, газ, вывоз и обезвреживание отходов.

Ставка квартплаты (техобслуживания), единая для всей республики, выросла с 9,07 до 9,53 рубля за квадратный метр общей площади.

Кроме того, на 5,5 процента (со 110 до 116 рублей) выросла плата за пользование радиоточкой. Электроэнергия подорожала на 20,8-21,2 процента (с 14,4 до 17,4 рубля за киловатт для городских жителей с газовыми плитами, с 10,4 до 12,6 рубля для городских жителей с электроплитами и сельского населения).

Количество разбоев растет

В минувшие выходные в Брестской области зарегистрировано большое количество разбоев. Так, в День защитников Отечества около 23 часов вечера в брестском микрорайоне Южный на женщину напал неизвестный. Ударив ее в лицо, он забрал сумочку, в которой находились ключи от квартиры, паспорт и небольшая сумма денег.

24 февраля около 22 часов в одну из барановичских квартир через незапертую дверь вошли двое неизвестных и забрали у хозяйки 30 тысяч рублей. В этот же день, но уже вечером, в Барановичский ГОВД обратился мужчина с заявлением о том, что трое неизвестных избили его и забрали кожаную куртку, 250 долларов США и 5 тысяч рублей. А 25 февраля в милицию обратился житель Пинска, которого также избил неизвестный, забравший часы и 5 тысяч рублей.

Лебедько доволен

Верховный Совет Беларуси 13-го созыва собирается направить спикеру Государственной Думы России Геннадию Селезневу письмо с благодарностью за помощь в деле сохранения статуса Верховного Совета в Парламентской ассамблее (ПА) ОБСЕ.

Об этом 26 февраля на встрече с журналистами в Минске сообщил вице-спикер Верховного Совета, лидер Объединенной гражданской партии Анатолий Лебедько. Пресс-конференция была посвящена итогам прошедшего 22-24 февраля в Вене заседания Постоянного комитета ПА ОБСЕ, на котором рассматривался вопрос о представительстве Беларуси в этой межпарламентской организации.

Евгений Крыжановский пошел в... президенты

Актер и главный режиссер Минского театра сатиры и юмора "Христофор" Евгений Крыжановский решил баллотироваться в президенты. И это не шутка.

— Я действительно хочу быть следующим президентом Беларуси, — говорит Евгений Анатольевич. — Такое решение, безусловно, переворачивает жизнь любого человека. Но, приняв его, нужно идти до конца. Назад дороги нет. Не думаю, что мое хождение в президенты окончится смертью или исчезновением. Впрочем, я ничего не боюсь...

("Народная Воля" — БелаПАН).

4 САКАВІКА — ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ МІЛІЦЫІ. СА СВЯТАМ, САЛДАТЫ ПРАВАПАРАДКУ!

ЖЫЦЦЁВЫ ВЫБАР



Па-рознаму прыходзяць на службу ў міліцыю маладыя людзі. Ігар Паўшко, напрыклад, пасля заканчэння СШ № 3 г. Івацэвічы служыў у арміі. Вярнуўшыся дамоў, яшчэ тры гады працаваў. Толькі пасля гэтага зрабіў свой выбар, надумаўся вучыцца — паступіў у акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў, што ў нашай сталіцы. Чатыры гады заняткаў — і Паўшко лейтэнант міліцыі.

Пачаў працаваць оперупаўнаважаным у крымінальным вышуку пад кіраўніцтвам вопытнага крыміналіста Аляксандра Іванавіча Глушэні. Вопыт, як кажуць, прыходзіць з гадамі. Але не толькі з імі. Старанне, выканаўчая дысцыпліна, адчуванне абстаноўкі, аналітычнасць і разважлівасць — гэтыя неад'емныя рысы дапамагаюць Ігару Паўшко выяўляць і выкрываць злачынцаў, распазнаваць іх па паводзінах і нават па "гладкіх" паказаннях.

Усё гэта дало магчымасць кіраўніцтву аддзела ўжо на трэцім годзе службы прызначыць Паўшко старшым оперупаўнаважаным групы нораваў і незаконнага абароту наркотыкаў. І тут малады супрацоўнік не падводзіць. Загадам Міністэрства ўнутраных спраў летась Ігару Паўшко за добрую службу датэрмінова было прысвоена званне старшага лейтэнанта.

Ігар Паўшко жанаты, мае малую дачку. У вольны ад службы час захапляецца баскетболам.

Святаслаў КАЖАДУБ.
Фота аўтара.



Хватит клевать на голый крючок

В актовом зале МПО недавно прошло собрание членов общества охотников-рыболовов. Вел его председатель общества Александр Купрейчик. Охотники — отдельная тема, а вот то, что касается рыбалки, как активного отдыха на Коссовском озере (урочище Марачовщина), обсудить, я думаю, стоит.

В среде рыболовов известно, что в 2000 году, весной, сюда якобы было запущено самим председателем общества 5000 карпиков-сеголеток. Этот карп — невидимка, и нужно, похоже, иметь удочку-невидимку, чтобы ловить его.

А поймать этого карпа под силу только агенту Малдеру. Так зачем мы вносили взносы на покупку малька?

М. Т., А. К.,
г. Коссово.

На это анонимное послание мы попросили ответить директора Ивацевичского охотхозяйства Александра КУПРЕЙЧИКА:

Мы имеем документы, которые подтверждают, что на 20000 рублей (со взносов рыболовов) в рыбхозе "Селец" (Березовский район) был закуплен посадочный материал карпа и белого амура. По причине жаркой погоды, мы не могли собрать толпу, чтобы засвидетельствовать выпуск малька, и сразу же выпустили рыбу в озеро. Но, тем не менее, составлен акт, под которым есть подписи ответственных лиц, как-то: председателя первичной организации Алексея Горяйнова, бухгалтера хозяйства Валентины Толочко, моя подпись.

...Ну не консервы же я делал из этого малька. А то, что не клюет... Озеро-то большое.

В минувшем году мы проводили районные соревнования по ловле рыбы в этом же озере. Ловился и зеркальный карп, и белый амур. Вообще, рыбу надо уметь ловить, не быть только амбициозным неудачником. Мы не маскируем свою деятельность. Если хотите знать или видеть объёмы нашей работы — обращайтесь. Конечно, анонимки проще писать...

В результате ДТП погибла женщина

БАРАНОВИЧИ. Как сообщили БелаПАН в пресс-службе управления МЧС, около полуночи 23 февраля дежурный Барановичского ГОВД сообщил МЧС о дорожно-транспортном происшествии на улице Фроленкова. Автомобиль "Ауди-100", которым управлял 24-летний житель Минской области М., врезался в дерево. Молодая женщина 22 лет, которая сидела на переднем сиденье, погибла на месте, водителя извлекли из автомобиля с многочисленными, но не тяжелыми ранами, а вот еще двое пассажиров оказались зажатыми на заднем сиденье. Освободить их было непросто — для этого понадобились гидравлические ножницы и полтора часа времени. У обоих молодых людей из Барановичей — тяжелые черепно-мозговые травмы и множественные переломы. Все пострадавшие сейчас находятся в больнице.

БелаПАН.

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

Цэны на рынках нашага рэгіёну па стану на 28.02.2001 г. (у руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны	Драгічын
Свініна	2500	2500—4000	2500—3600	2500—3300	2500—2800
Сала салёнае	1900—2500	1800—2800	2500	2600	2300—2500
Алей (1 л)	750—1000	700—1100	750—950	800—1100	800—1200
Яйкі	900—1000	800—1000	1000	1000	800—1100
Малако (3 л)	600	600	600	600	600
Шпроты	450	400—420	450	400—450	470—500
Масла сметанк.	1900	2000	2000	2000	2000
Бульба	80—100	100—120	100	100—120	90—100
Цыбуля	250	220	250	200	200—220
Морква	200	150—180	180	180	170—190
Капуста	100	150—180	80—200	100—120	80—100
Грушы	1600	600—1000	—	—	—
Буракі	60—80	100	60—80	80	75—80
Мандарыны	1800—2000	1500—1800	1800	1800—2100	1700
Грэцкія арэхі	1800	1300	1500	1300—2100	1350—1450
Яблыкі	500—650	300—800	300—500	420—500	300—470
Маянэз	250—450	240—420	240—420	240—450	320—480
Вінаград	5000	3500—5000	4000	—	—
Хурма	2500	2000—2300	—	—	2000—2100
Часнок	800—1600	1800	1000	800	550—600
Лімоны	1400—1500	1300—1500	1500	1450	1200
Апельсіны	1200	1300	1200	1400	1100
Бананы	1100—1200	950—1200	1100—1200	1450	1200—1300
Гранаты	1900	1900	1800	1600—1800	1800
Грэчка	550—660	650	550—600	700	550—600
Макар. вырабы	520—560	500—560	600	500—600	500—650
Рыс	500—540	500—520	550	550	530—550
Манныя крупы	500	460	500	500	500—510
Проса	320—350	330	360	400	360—380
Цукар	560	560	550	560	580—590
Мёд	4.000	4.000	3.600	4.000	4.000

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	1240	1300	1240	1300	1240	1300	—	—	1235	1285
1 дойчмарка	560	600	580	600	580	600	—	—	530	590
1 рубель Расіі	43	45	42	44	42	45	—	—	42	45

НАБЛЮДЕНИЕ ЗА ВЫБОРАМИ

Подготовка к выборам Палаты представителей

К выборам Палаты представителей власти Беларуси готовились заранее. Уже в 1999 году началась работа над новым Избирательным кодексом, который должен был регламентировать проведение всех выборов и референдумов в Беларуси. За основу был взят Закон о выборах местных Советов, принятый в конце 1998 года и "проверенный" на практике весной 1999 года. Следует отметить, что этот закон, по мнению как белорусских, так и иностранных экспертов, не соответствовал основным требованиям ратифицированного Беларусью Копенгагенского документа, называемого также "обязательствами по ОБСЕ". Следовательно, обязательствам по ОБСЕ не соответствовал и разработанный на его основе Избирательный кодекс. Так, например, в его первоначальном варианте вместо общепринятого понятия "наблюдатель" появился термин "представитель общественных объединений, партий, трудовых коллективов и др.". У этого "представителя" вообще не было никаких прав и возможностей за чем либо наблюдать, он мог только "присутствовать".

Но для того, чтобы легитимность Палаты представителей была признана международным сообществом, Избирательный кодекс должен был соответствовать общепринятым требованиям. После сделанного ОБСЕ вывода о недемократичности белорусского избирательного законодательства белорусские власти несколько "подправили" первоначальный вариант кодекса.

Из всех предложенных поправок власти приняли самые несущественные. Исключением было лишь появление понятия "наблюдатель", хотя значительно сокращены и сужены предложенные участниками диалога полномочия наблюдателя. В результате оказалось, что наблюдатель вообще не имеет права ... наблюдать за процедурой подсчета голосов избирателей, не говоря уже о предложенной на диалоге возможности наблюдать за этим подсчетом с расстояния, обеспечивающего обозримость содержимого бюллетеней. Он также не имеет права получить заверенную копию итогового протокола участковой комиссии. Зато удалить наблюдателя председатель комиссии может в любой момент своим произвольным решением. Все остальные предложения диалога приняты не были.

В результате накануне выборов Палаты представителей сложилась ситуация, не позволяющая надеяться на то, что они будут открытыми и честными. Да и как их можно считать таковыми, если наблюдатели не имеют узаконенной возможности наблюдать за всеми стадиями избирательного процесса и получать достаточно полную информацию о подготовке и проведении выборов. К тому же, если в избирательных комиссиях отсутствуют представители независимых от власти структур.

Наблюдение за выборами Палаты представителей

Нарушения и без того несовершенного Избирательного кодекса начались сразу же после объявления даты выборов. Практически все они были совершены избирательными комиссиями и властями. Так как избирательные комиссии почти полностью были укомплектованы "проверенными" людьми, то только в очень редких случаях они отказывались выполнять незаконные требования властей.

Наиболее массовыми были следующие нарушения: повсеместный необоснованный отказ включить в состав избирательных комиссий представителей независимых общественных структур; попытки не допустить часть наблюдателей на избирательные участки; руководство и тотальный контроль исполнительной власть за деятельностью избирательных комиссий; предвзятый подход к ряду кандидатов в депутаты при их регистрации; использование административного ресурса для поддержки некоторых кандидатов в депутаты; принуждение избирателей к досрочному голосованию и другие.

На основании анализа этих, принявших массовый характер, нарушений, можно было сделать вывод о закрытости, нечестности и недемократичности выборов.

Но и на этом нарушения избирательного законодательства не закончились. Согласно результатам суммирования данных из имеющихся у наблюдателей заверенных копий итоговых протоколов участковых комиссий оказалось, что выборы не состоялись почти во всех избирательных округах Минска, Могилева, Бобруйска, Гомеля, Молодечно, Солигорска и ряда других регионов. Здесь, по объективным подсчетам, явка избирателей составила менее 50%. Согласно же официальным данным, объявленным на второй день после выборов, во всех этих округах выборы состоялись: явка избирателей превысила 50%. На самом деле не было подтасовок в трех округах Минска, как раз там, где баллотировались лидеры оппозиционных политических партий Статкевич, Калякин и Гайдукевич. Аналогично произошло также в Бресте, Витебске, Барановичах и Борисове: здесь избирательные комиссии или отказались, или просто не успели сфальсифицировать результаты выборов, и властям пришлось признать выборы по этим округам не состоявшимися.

Вполне возможно (хотя у нас и нет полных данных), что без фальсификаций явки избирателей выборы могли не состояться в более чем 38 округах. В таком случае выборы Палаты представителей следовало бы считать не состоявшимися в целом.

Чтобы разобраться в такой ситуации, руководство ОО "БРКИ", последовательно как и предусмотрено Избирательным кодексом, прошло все инстанции, пытаясь установить истину. Однако никакого результата, увы, это не дало.

Подготовка к наблюдению за президентскими выборами

Результаты наблюдения были нами тщательно изучены и проанализированы. Оказалось, что главным итогом наблюдения стало не столько фиксация целого "букета" нарушений избирательного законодательства, сколько настойчивое напоминание членам избирательных комиссий всех уровней, властям, да и избирателям о том, что избирательное законодательство необходимо выполнять, а не нарушать его даже тогда, когда властям это очень хочется. Для некоторых членов избирательных комиссий стало открытием, что выборы следует проводить так, как записано в законе. Впрочем сам факт такого понимания оказался недостаточным для того, чтобы избирательные комиссии прекратили нарушать избирательное законодательство. На основании полученного опыта был сделан вывод: при наблюдении за будущими выборами наиболее эффективным для предотвращения нарушений может стать массовые персональные обращения наблюдателей в прокуратуру и суды по всем обнаруженным отклонениям от требований избирательного законодательства.

Беларусь в ожидании осенних президентских выборов. Клубы избирателей вместе с другими общественными структурами уже начали подготовку к наблюдению за ними. Наша основная цель - добиться того, чтобы выборы были справедливыми и демократическими. Пусть на них победит достойный, но в честной и открытой борьбе. Воля избирателей должна быть осознанной, но ни вкоем случае не искажена и не подтасована.

Владимир ГУДЕЕВ,
председатель ОО "Белорусский республиканский клуб избирателей".

Хто дапаможа Творцу?

ДРАГІЧЫН. Размова пойдзе пра мясцовага жыхара Васіля Фёдаравіча Макуху, ветэрана вайны і працы, таленавітага самадзейнага скульптара. Сярод работ Творцы асабліва вылучаецца серыя партрэтаў Янкі Купалы. Прозвішча Макухі сустракаем у кнізе "Янка Купала. Энцыклапедычны даведнік". Там запісана: "В. Ф. Макуха выканаў серыю партрэтаў Купалы і кампазіцый на тэмы з жыцця паэта: барэльеф Я. Купалы (1955 г., мармур, знаходзіцца ў Канадзе), бюст Я. Купалы (1958 г., мармур, музей Я. Купалы), "Янка Купала з піянерамі" (не збярогся, захаваўся толькі на фотаздымках), бюст Купалы (1961 г., дрэва, знаходзіцца ў Дзяржаўным музеі БССР)".



Янка Купала з піянерамі.
Скульптура В. Макухі.

Зараз Васіль Фёдаравіч Макуха — стары чалавек. Жыве ў Драгічыне. І як быццам яго там і няма, бо ніхто не звяртае ўвагі на былыя франтавыя і творчыя заслугі ветэрана. У хаце холадна, бо дровы, што заказаў, доўга не падвозілі. А вочы заслала катаракта. Недалёкая будучыня вельмі сумная. Хто ж дапаможа Васілю Фёдаравічу? Няўжо ўсе людзі ачарсцвелі? На жаль, пакуль што так гэта.

Ганна ШЫПУК.

Идёт охота на волков

Держись, серый хищник!



Фото А. Горбача.

24 февраля оказался очень удачным днём для охотников Ивацевичского БООР. Именно в этот день на территории Воленского и Житлинского сельских советов группой охотников были добыты три волка (на снимке).

Эта небольшая стая уже давно контролировала ситуацию и здесь, и на Телеханщине, курсируя из одного лесного массива в другой. Их малочисленность не предоставляла возможностей для атаки лося (хотя попытки были), но поросята, козы вовсю прочувствовали "ласку" серого хищника.

В этот день охота прошла на удивление удачно, хотя ни для кого не секрет, что охота на волка — очень сложное, тонкое дело. Возможно, бдительность волков усыпила удачная охота предыдущего дня, когда им удалось задавить козу.

Так или иначе, но операция, которая началась в 10.30, закончилась в 18.00 полной ликвидацией стаи.

Александр ГОРБАЧ.
г. Ивацевичи.

Кандидат должен быть от народа

Прочитал в вашей газете статью "Кто он — будущий президент?" и решил поделиться своими мыслями и наблюдениями.

До президентских выборов ещё далеко, но подготовка к ним, на мой взгляд, идёт вовсю. Кого же прочит власть? Сам Лукашенко утверждает, что не видит в Беларуси своего преемника, его просто нет. Скорее всего, он не хочет не только видеть, но и слышать об этом.

А что же оппозиция?

Она, по-моему, разобщена, и каждая партия старается выдвинуть своего кандидата в президенты. Как говорят, каждый тянет одеяло только на себя.

Будет ли с этого какой-то толк? Я считаю, что нет. Моё утверждение основывается на том, что власть сделает всё необходимое, чтобы никто из выдвинутых кандидатов не был хорошо знаком общественности с положительной стороны. Посмотрите, что выделывают на радио, телевидении президентские чайки, зимовские, дудиновы, сергеевы, казиятки? Как они, не стыдясь и не пряча глаза, обливают грязью каждого, кто осмелился не только сказать правду о сегодняшней жизни, а даже задать вопрос по этому поводу.

Поэтому справедливых выборов, как и раньше, я думаю, не может быть. Кандидаты будут поставлены в неравные условия. За одного — радио, телевидение, государственные СМИ, а за другого или за нескольких сразу — только независимая пресса.

Если будет несколько кандидатов от оппозиции, то это уже гарантия того, что ни один из них дальше первого тура не пройдёт.

Уже сегодня ясно (и это не только моё личное мнение), чтобы выбраться из нищеты, чтобы жить лучше, надо избирать нового президента. По себе знаю: за последние шесть лет моя жизнь не улучшилась, а значительно ухудшилась, и ничего хорошего впереди не вижу.

Кого же выбирать? Лучше независимого кандидата, кандидата из народа, человека опытного, волевого, крупного хозяйственника.

Борис ВАСИЛЕВСКИЙ.
г. Берёза.



(Працяг. Пачатак у №№ 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8).

VII. ХТО Ж ГЕРОЙ! КАСЦЮШКА, КУТУЗАЎ ЦІ СУВОРАЎ!

1.

Сёння ўжо ніхто не сумняваецца ў тым, што наш зямляк Тадэвуш Касцюшка — сапраўдны народны герой не толькі сваёй краіны і Польшчы, але і Злучаных Штатаў Амерыкі, за свабоду і незалежнасць якіх ён змагаўся восем гадоў.

Важна заўважыць, што толькі ў апошнія гады прагрэсіўная грамадскасць нашай Беларусі павярнулася тварам да ўласнай гісторыі. Невыпадкова кажуць, што той народ, які не ведае свайго мінулага, сваёй спадчыны і горш таго — грэбуе ёй, не мае будучыні.

Адзін з крокаў да ўвекавечання памяці Тадэвуша Касцюшкі зрабілі мясцовыя ўлады. Ва ўрочышчы Марачоўшчына ў лістападзе мінулага года, дзе некалі быў маёнтак нашага славутага земляка, быў урачыста адкрыты памятны знак яму, Касцюшку, сыну зямлі беларускай.

Яшчэ Аляксандр Твардоўскі сказаў: "Нет героев от рождения, — они рождаются в боях". Менавіта ў такіх баях нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка і адразу атрымаў прызнанне народаў і памяць на доўгія гады.


А. В. Сувораў.


М. І. Кутузаў.

2.

Калі заходзіць гаворка пра Айчынную вайну 1812 года, то адразу ўспамінаецца не хто іншы, а М. І. Кутузаў. І сёння з памяці народнай не выветрылася выслоўе: "Прыйшоў Кутузаў біць французаў". Менавіта пад яго кіраўніцтвам пачалася ўсенародная вызваленчая вайна супраць захопнікаў, а на акупіраваных тэрыторыях разгарнуўся партызанскі рух. Як пісаў Леў Талстой, дубіна ўсенароднай барацьбы паднялася супраць акупантаў і "гвоздила" іх да таго часу, пакуль ніводнага з іх не засталося на роднай зямлі.

Народным героем, вялікім палкаводцам зрабіла Кутузава Айчынная вайна. Вызваленчая. А не тая, якую вёў супраць туркаў або французаў за межамі Расіі ў 1805 годзе. Тыя перамогі або паражэнні заўважалі хіба толькі цары і іх спадчыннікі, якія накіроўвалі свае войскі на захопніцкія войны ці для падаўлення народнага руху ўнутры краіны ці за мяжой. Імена на такіх войнах і вылучыўся расійскі ваенны камандзір А. В. Сувораў.

3.

У Беларускай савецкай энцыклапедыі (1974 год) сказана, што А. В. Сувораў — рускі палкаводзец, стваральнік рускага ваеннага майстэрства. Генералісімус. Выпусціў сваю працу "Навука перамагаць". Дзе і каго ён перамагаў?

У 1768—1772 гадах ваяваў супраць польскіх войск Барскай канфедэрацыі, пад Сталовічамі (каля Баранавічаў) разбіў корпус Міхаіла Казіміра Агінскага. Граміў ворага ў руска-турэцкай вайне. Для ўдушэння паўстання пад кіраўніцтвам Пугачова быў пасланы на Урал, а затым у іншую краіну, Рэч Паспалітую, таксама для задушэння паўстання 1794 года на чале з Касцюшкам, дзе пад Крупчыцамі (ля Кобрына) і пад Брэстам разбіў корпус генерала Ю. Серакоўскага, авалодаў Варшавай... За перамогі над паўстанцамі і вернасць царскай уладзе Кацярына II надала Сувораву званне генерал-фельдмаршала і падаравала яму ў вечнае і патомнае валоданне "волость Кобринскую и другие — 13279 душ".

Пералік перамог Суворава можна было б прадоўжыць. Але варта нагадаць, што гэты палкаводзец не ўдзельнічаў ні ў адной абарончай ці Айчыннай вайне. У гады ваеннай кар'еры Суворава на Расійскую імперыю ніхто не нападаў, а, наадварот, Расія пашырала свае межы. Усе захопніцкія планы Кацярыны II увасабляў у жыццё іменна Сувораў.

4.

Па ўсім відаць, Сталіну падабалася сувораўская адданасць, яго навука "перамагаць". Таму невыпадкова па загаду правадыра ўсіх народаў у 1943 годзе былі створаны сувораўскія вучылішчы. Як сцвярджаюць сёння многія ў нашай Беларусі, вучылішчы, дзе падлеткам прывіваецца ваеннае мысленне, павінны былі б называцца кутузаўскімі або лепш касцюшкаўскімі. Кутузаў, напрыклад, бліскуча перамог напалеонаўскае нашэсце, Касцюшка стаў народным героем, а Сувораў выдатна задавальняў захопніцкія жаданні царыцы Кацярыны II, а потым іншых цароў.

Такім чынам, розніца паміж Касцюшкам і Кутузавым, з аднаго боку, і Суворавым — з другога, вельмі прынцыповая.

Думаецца, што для Беларусі вялікая абраза, што яна да гэтага часу шануе свайго заваёўніка і аддае сваю моладзь у вучылішча, названае імем Суворава і размешчанае ў цэнтры Мінска. Пры тым у Кобрыне дзейнічае сувораўскі музей. Нямала вуліц нашых гарадоў, калгасаў і саўгасаў рэспублікі носяць імя Суворава. Варта задумацца, каго ўшаноўваем, пра каго беражом незаслужаную памяць. Няўжо на беларускай зямлі перавяліся сапраўды выдатныя, славутыя людзі, нашы землякі, якія, як і Касцюшка, пакінулі пра сябе добрую славу ў народзе?

VIII. ПАМЯЦЬ ПРА КАСЦЮШКУ. ЯКАЯ ЯНА?

1.

Вядома, што астанкі Тадэвуша Касцюшкі з швейцарскага горада Салюр у 1818 годзе перавезлі ў Кракаў і пахавалі ў кафедральным саборы на Вавелі. У пахавальнай цырымоніі ўдзельнічаў у якасці афіцыйнага прадстаўніка горада Салюр Францішак Ксавэры Зэльтнер са сваім сынам Францішкам, які пазней удзельнічаў у паўстанні 1830—31 гадоў.

Аднак, можа, не ўсе ведаюць, што пасля смерці Касцюшкі яго цела было бальзаміравана. Выдаленыя ўнутраныя органы гаспадар маёнтка Францішак Зэльтнер, дзе апошнія гады жыў наш зямляк, пахаваў на могілках у Зухвілі недалёка ад Салюры і паставіў сціплы помнік — трохступенчаты шасцігранны пастамент, увенчаны шарам з пазалочаным крыжам і промнямі сонца. Гэтыя могілкі неўзабаве становяцца месцам паломніцтва польскіх эмігрантаў. Яны ж у 1844 годзе аздобілі помнік медальёнам з выявай Касцюшкі. Гэты медальён вырабіў французскі скульптар П'ер Жан Давід д'Анжэр.

2.

І яшчэ адна цікавая дэталь. Пасля бальзаміравання цела Касцюшкі, як гаварылася вышэй, яго ўнутраныя органы былі пахаваны на могілках, акрамя сэрца. Для захавання сэрца была выраблена спецыяльная і даволі арыгінальная урна. Захоўвала яе Эмілія Зэльтнер, хрэсніца, вучаніца і любіміца Кіраўніка паўстання, якой Касцюшка ахвяраваў сваё сэрца. Пасля яе смерці урна захоўвалася сям'ёй Марасіні ў малой капліцы ў садзе каля іх вілы ў Вэзіі недалёка ад Лугана.


Урна, у якой некалі захоўвалася сэрца Тадэвуша Касцюшкі. Скульптар Віцэнт Траяноўскі.


Помнік Тадэвушу Касцюшку ў сталіцы ЗША Вашынгтоне (па праекту А. Попеля, 1910 г.).

У 1870 годзе ў Рапэрсвільскім замку адкрыўся польскі нацыянальны музей, на другім паверсе якога афармілі "Пакой Касцюшкі". Тут былі розныя рэчы Кіраўніка паўстання.

Да святкавання сотай гадавіны паўстання 1794 года дырэкцыя гэтага музея планавала пачаць урачыстасці з цырымоніі ўстанаўлення на рапэрсвільскай пляцоўцы урны з сэрцам Касцюшкі. Але перамовы з сямействам Марасіні закончыліся безвыннікова. Толькі два славутыя італьянцы кампазітар Джузэпе Вердзі і паэт Арыга Баіта змаглі дамовіцца з уладальнікамі гэтай зусім неардынарнай рэліквіі. Урачыстая перадача урны адбылася якраз у гадавіну смерці Касцюшкі 15 кастрычніка 1895 года.

А ў жніўні 1897 года адбылася урачыстае адкрыццё маўзалея і змяшчэнне там урны з сэрцам Касцюшкі.

3.

Урачыстае адкрыццё музея Касцюшкі ў Салюры адбылося 27 верасня 1936 года. Яно супала з 190-й гадавінай з дня нараджэння Кіраўніка паўстання. На гэтую падзею паўплывала і тое, што ў 1927 годзе рапэрсвільская калекцыя была перавезена ў Польшчу, і Польскі нацыянальны музей перастаў існаваць.

Трэба зазначыць, што за мяжой рэгулярна адзначалі і адзначаюць розныя юбілеі, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Тадэвуша Касцюшкі. Нават у перыяд першай сусветнай вайны ў Салюры адбылося святкаванне сотай гадавіны з дня смерці Касцюшкі. У ім удзельнічалі польскія дэлегаты, а таксама эмігранты, прадстаўнікі мясцовай улады і школьная моладзь.

Касцюшка, які ваяваў за незалежнасць ЗША, не забыты ў гэтай краіне. Помнікі нацыянальнаму герою пастаўлены ў Вашынгтоне, Чыкага, Кліўлендзе і Мілуоках. У штаце Місісіпі невялікі горад названы імем Касцюшкі.

Палякі таксама беражна шануюць памяць пра Касцюшку, пра свайго нацыянальнага героя. Яго імем у 1943 годзе названа першая пяхотная дывізія Войска Польскага. 12—13 кастрычніка гэтая дывізія разам з Чырвонай Арміяй удзельнічала ў баях пад Леніна (вёска ў Горацкім раёне Магілёўскай вобласці). За ўдзел у гэтым баі 240 воінаў першай дывізіі імя Касцюшкі Войска Польскага былі адзначаны савецкімі ордэнамі і медалямі, а А. Высоцкі і А. Кжывень былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Гэтая ж дывізія ўдзельнічала ў вызваленні Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У вёсцы Леніна створаны музей савецка-польскай баявой садружнасці, а таксама пастаўлены помнікі на трох брацкіх магілах савецкіх воінаў і воінаў дывізіі імя Касцюшкі Войска Польскага.

Святаслаў КАЖАДУБ.
Івацэвіцкі раён.
(Заканчэнне будзе).

МАТЬ

"Поклонимся женщине-матери, любовь которой не знает границ, грудью которой вскормлен весь этот мир"

(Максим ГОРЬКИЙ).

Предела материнской любви, конечно же, нет. И счастлива та мать, которой не выпал жребий определять, скажем так, глубину чувства: слишком много в таком случае предстоит выстрадать женщине, которая, разумеется, пройдет положенный ей путь от начала до конца.



4 августа — роковая дата в семье Лидии Ивановны Голушко, жительницы деревни Могилицы Ивацевичского района. В этот день, в 1980 году, с её сыном Анатолием произошел страшный случай, наложивший отпечаток на всю его дальнейшую жизнь...

...Высокорослый, крутоплечий Анатолий (автор сей статьи пишет не со слов, а по памяти) в кругу сверстников выделялся не только своей статной внешностью (хотя и этого хватало, чтобы с него не сводили глаз девчата), но и уравновешенностью, уверенностью в себе. Закончив школу, Анатолий поступил в Калининградскую "мореходку" — призвание, достойное настоящего мужчины. 4 августа (уже получен вызов на учебу) он отправился вместе со своим старшим братом Колей купаться на Щару (река, кстати, находится в нескольких сотнях метров от их дома). Привычный прыжок в воду с берега — и неожиданный удар руками, головой о грунт, которого здесь как бы и не должно быть, здесь всегда было глубоко (Анатолий знал все изгибы и повороты родной Щары). Волна вынесла неподвижное тело Анатолия (он сломал позвоночник) наверх, остолбеневший от увиденного брат вытащил его на берег и, полный ужаса, побежал в деревню.

Рассказывает Лидия Ивановна:

— Сразу после случившегося мы, разумеется, обратились в Ивацевичское РТМО. Девять месяцев сын пробыл там, всё это время его состояние было критическим. Потом перевели в Бытенскую больницу, и, как мне показалось, ему там стало лучше. Мы с мужем бросились искать помощь: возили Толю и в российские города, и в знаменитую украинскую деревню Кобыляки к доктору Касьяну, и в открывшийся в Минске медицинский центр. Всюду специалисты пробовали помочь — и разводили руками.

Теперь представьте, с какими горькими мыслями умирал мой муж, отец Толи (он умер в 1986 году, болел), видя, что сын его так и не встал на ноги. А ведь отец не меньше выстрадал за здоровье и жизнь сына, чем выстрадала я.

Анатолий остался жив, но он практически недвижим все эти 20 лет. Но, самое отрадное, он не упал духом, угнетенности и безысходности в нашем доме нет. Нас не забывают его друзья, соседи, родные; я особенно благодарна друзьям: молодежь, ребята и девчата приходят к нам и днем, и вечером, даже ночью. Идут на танцы — заходят, идут с танцев — тоже; женятся, выходят замуж, уходят служить в армию — не забывают зайти. У нас часто бывает шумно и весело. Я дверь не запираю никогда.

Друзья приезжают с женами, с новыми друзьями, приходят новые специалисты колхоза, школы. Вы не поверите, но у Толи друзей стало как будто и больше.

Лет этак около шести назад Анатолий начал пробовать рисовать. А ведь способность работать руками у него сохранилась на... 20 процентов. Дотягивается лицом к кисточке (если меня нет рядом), берет ее зубами, передвигает медленно в руке. Картин у нас, как видите, предостаточно (об этом мы еще поговорим, читатель дорогой — **авт.**).

Рассуждает Анатолий:

— Это — судьба, сам рок толкал меня в тот день к реке. Я ведь хорошо помню тот день, его порядок с самого начала был нарушен, я не должен был идти купаться, даже помню, что и желания не было, отнекивался, но брат уговорил...

Но что я теперь был бы без матери? Со мной она провозилась больше, чем с остальными моими братьями и сестрой вместе взятыми. Это хорошо, что ты решил заострить внимание на ней. У неё большое материнское сердце...

....Мы расстались с Анатолием, я в очередной раз пообещал приходить чаще, надеюсь, сдержу своё слово. А в памяти у меня осталось высказывание Лидии Ивановны, которое я слышал еще годом-двумя ранее: "Если бы мне сказали, что пусть всё пропадет, сгорит, исчезнет, а я останусь босой и голой на пепелище — на всё согласна, только бы встал мой Толик..."

Александр ГОРБАЧ.

г. Ивацевичи.

P. S. Кстати, в Ивацевичском ГДК открылась выставка картин Анатолия Голушко. Приходите, уважаемый читатель, и убедитесь, что мы со своими стопроцентными способностями работать, двигать руками не создадим и половину того, что создал Толя.

P. P. S. И не говорите после этого, что вы, здоровый и румяный, бываете несчастным...

Нашы жанчыны самыя прыгожыя, разумныя, добрыя?

Разважаюць жыхары горада Івацэвічы



Іван Афанасьевіч: Тое, што прыгажэйшых за беларускіх жанчын нідзе няма, безумоўна. Вельмі хацеў бы звярнуць увагу на яшчэ адну якасць беларусак — працавітасць. Нашы жанчыны могуць зрабіць шчаслівым любога чалавека.



Валерый: Згодзен. У маім жыцці нямала было сустрэч і знаёмстваў, таму магу адназначна сцвярджаць, што нашы дзяўчаты — самыя прыгожыя, самыя разумныя, самыя культурныя. І больш абаяльныя чым, напрыклад, на Захадзе. Думаю, што большасць мужчын з гэтым згодны.



